МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

БЕЛАРУСКІ
ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

РАШЭННЕ

26.05.2014 г. № 5/1-РС
г. Мінск

МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

БЕЛОРУССКИЙ
ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ

РЕШЕНИЕ

г. Минск

Савета БДУ
«Моладзевыя грамадскія арганізацыі
і органы студэнцкага самакіравання БДУ:
удзел у кіраванні ўніверсітэтам і
ўплыў на якасць адукацыі»

1. Прызнаць працу моладзевых грамадскіх арганізацый і органаў студэнцкага самакіравання БДУ здавальняючай.
2. Адзначыць вялікі ўклад студэнцкіх арганізацый і органаў студэнцкага самакіравання БДУ ў кіраванне ўніверсітэтам і павышэнне якасці адукацыйнага працэсу
3. Кіраўнікам моладзевых грамадскіх арганізацый і органаў студэнцкага самакіравання сумесна з упраўленнем выхаваўчай работы з моладдзю (Скалабан П.В.) да 01.11.2014 г. распрацаваць, абмеркаваць на пасяджэннях Саветаў структурных падраздзяленняў і ўнесці на разгляд Савета БДУ палажэнне аб калегіяльным органе моладзевых грамадскіх арганізацый і студэнцкага самакіравання ўніверсітэта.
4. Увесці ў практыку працы рэктарата правядзенне пашыраных пасяджэнняў з удзелам прадстаўнікоў моладзевых грамадскіх арганізацый і органаў студэнцкага самакіравання БДУ.
5. Упраўленню выхаваўчай работы з моладдзю (Скалабан П.В.) сумесна з Галоўным упраўленнем вучэбнай і навукова-метадычнай работы (Хухлындзіна Л.М.) да 15.10.2014 г. распрацаваць і зацвердзіць ва ўстаноўленым парадку Палажэнне аб стыпендыі Савета БДУ за поспехі ў навукова-даследчай, грамадскай, творчай, спартыўнай дзейнасці студэнтам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.
6. Дэканам факультэтаў, кіраўнікам устаноў адукацыі БДУ:

6.1. забяспечыць удзел моладзевых грамадскіх арганізацый і органаў студэнцкага самакіравання ў пасяджэннях дэканатаў, кафедраў для абмеркавання пытанняў якасці адукацыі, абароны правоў і інтарэсаў студэнтаў, прыняцця кіраўніцкіх рашэнняў.

6.2. арганізаваць сумесную працу са Студэнцкім саветам па якасці адукацыі па рэалізацыі Палажэння аб арганізацыі дысцыплін па выбары ў БДУ.

7. Намесніка прарэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях (Чарапеннікаву М.Б.) з мэтай больш шырокага прыцягнення замежных студэнтаў у грамадска-значную дзейнасць у тэрмін да 30.09.2014 г. унесці ва ўстаноўленым парадку змены ў лакальныя нарматыўныя дакументы, якія забяспечваюць наяўнасць у складзе студэнцкіх саветаў інтэрнатаў не меньш за 10 % замежных грамадзян.
8. Зацвердзіць План працы ідэалагічнай і выхаваўчай работы ў БДУ на 2014-2015 навучальны год. Першаму прарэктару (Жураўкоў М.А.), прарэктару па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях (Сувораў У.В.) забяспечыць выкананне названага плана ў поўным аб'ёме.

Старшыня Савета БДУ — С. У. Абламейка

Вучоны сакратар Савета БДУ — С. М. Ходзін